# ЦІ ЗАЎСЁДЫ РЭЦЭНЗЕНТ МАЕ РАЦЫЮ?
# (Водгук аўтара на рэцэнзію яго кнігі "Магілёў у XII-XVIII стагоддзях", напісаную І. Ганецкай)

*Аўтар водгуку лічыць неабходным растлумачыць, чаму ён змяшчавецца не ў Беларускім гістарычным аглядзе(далей БГА, дзе была змешчана згаданая рэцэнзія), а на старонках іншага навуковага выдання. Адразу пасля азнаямлення з рэцэнзіяй І.Ганецкай на сваю манаграфію "Магілёў у 12-18 стагоддзях" аўтар даслаў водгук на адрас рэдакцыі. Гэта адбылося ў красавіку (1999 года). Пасля працяглага маўчання рэдактар часопіса, Генадзь Сагановіч, спачатку паабяцаў яго надрукаваць без зменаў з рэдакцыйным каментарыем, потым ён пачаў казаць, што водгук мусіць быць адрэдагаваны рэдакцыяй часопіса і побач з ім, у працяг палемікі, будзе змешчана яшчэ адна рэцэнзія на маю кнігу. Я і з гэтым пагадзіўся. У выніку – водгук увогуле не выйшаў у чарговым нумары БГА. Прычым ніякіх тлумачэнняў ад рэдакцыі аўтар да гэтага часу не атрымаў. Афіцыйна ніхто з прадстаўнікоў рэдакцыі не адмаўляўся, і да гэтага часу не адмовіўся, ад абяцання змясціць мой адказ рэцэнзенту. Але выглядае, што ў нашым выпадку ўсё дакладна па беларускай прымаўцы – абяцанкі цацанкі…*

### Водгук на рэцэнзію І.Ганецкай

*Некоторые думают, что стоит только*
*обозвать всех дураками, чтобы прослыть умным.*
В.О. Ключевский.

Рэцэнзія на манаграфію, як правіла, рэч карысная, нават калі яна мае адмоўны характар. Крытычныя заўвагі дазваляюць пад іншым вуглом гледжання паглядзець на пэўныя праблемы, спрыяюць паўставанню навуковага дыялогу паміж аўтарам і зацікаўленымі чытачамі. Менавіта таму аўтар шчыра дзякуе спадарыні Ганецкай за шэраг слушных крытычных заўваг, якія будуць абавязкова ўлічаны пры наступным перавыданні кнігі. Але большасць з іх нам падаліся няслушнымі, альбо слушнымі толькі часткова. У сувязі з гэтым падаецца неабходным аспрэчыць пэўныя тэзы рэцэнзента, бо, на жаль, многія з іх носяць эмацыйны характар і не грунтуюцца на фактычным матэрыяле.

Рэцэнзентка ставіць пад сумненне факт існавання ў Магілёве матэрыялаў XI і XII-XIII стст. Ёй таксама не зразумела, што маецца на ўвазе пад Магілёвам XII-XIIIстст. У сувязі з гэтым нават ставіцца пад сумненне факт існавання культурнага слою дамангольскага перыяду, сцвярджаецца, што аўтар не вылучыў аніводнага комплекса, які пацвердзіў бы ягоныя тэзы.

Пачнем па парадку. Што да XI стагоддзя. Рэч ідзе аб адзінкавых, знойдзеных на мацерыку фрагментах керамікі, прафіліроўка якіх характэрна для гэтага часу, донцах гаршкоў з выявай "трызуба" і шматчастковай, з сіняга празрыстага шкла, пацеркі-пранізкі. Яшчэ раз паўтаруся, што ўсе гэтыя рэчы

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

знойдзены на мацерыку. Магілёўская кераміка, пра якую ідзе гамонка, аналагічна кераміцы з закрытых курганных комплексаў і культурнага слою Чавускага селішча, якое даследаваў доктар гістарычных навук Я.Рыер. Тое ж самае тычыцца і керамікі XII-XIII стст. Што да донцаў гаршкоў з выявай «трызуба» (Мал. 26:3), то хочацца яшчэ раз падкрэсліць той факт, што атрыбуцыя яго як князкага знака Уладзіміра Хрысціцеля і датаванне канцом X-XI ст. не аспрэчваецца ***ніводным*** абазнаным у гэтым пытанні даследчыкам [3,с.38; 4, с.109; 6; 8, с.39-40]. Апошняе цалкам тычыцца і пацеркі-пранізкі (Мал. 59:2). Усе даследчыкі аднадушна сцвярджаюць, што такі тып вырабаў у цэнтральных раёнах Усходняй Еўропы ўжываўся да XI ст. [4, с.100; 5, с.119; 7, Мал. 5:4]. Можа быць традыцыйныя ў археалогіі датыроўкі ў дачыненні да гэтых відаў рэчаў перагледжаны? Адказу на гэта ў рэцэнзіі мы не знойдзем, як марна шукаць і спасылкі на спецыяльную літаратуру ў спадарыні Ганецкай для доказнага адмаўлення датыровак вышэйзгаданых матэрыялаў.

Мякка кажучы, не зусім аб'ектыўна выглядае аўтарка рэцэнзіі, калі ставіць пад сумненне факт вылучэння слою XII-XIIIстст. Чытач можа пераканацца ў гэтым, разгарнуўшы кнігу на 156 старонцы, дзе апісана стратыграфія найбольш важнага для вырашэння гэтага пытання раскопу, а таксама звярнуўшыся да табліцы № 4, у якой адлюстравана размеркаванне шкляных бранзалетаў у раскопах і траншэях магілёўскага замчышча. Хачу падкрэсліць, што тут аўтар спасылаецца толькі на той рэчавы матэрыял, які быў знойдзены менавіта пры даследаванні ***гэтага*** закрытага комплексу. Як ведама, вылучэнне слоя XII ст. па археалагічным матэрыялам не ўяўляе вялікай цяжкасці. Слой таго часу надзейна дакументаваны з'яўленнем шкляных бранзалетаў, гарызонт сярэдзіны XII ст. маркіруе масавае з'яўленне гэтых прадметаў, а іх максімальнае распаўсюджанне прыпадае на канец XII – 40-я гады XIII ст. [2, с.41, 273]. Такая заканамернасць выразна прасочваецца і ў магілёўскіх матэрыялах. Знойдзены рэчавы матэрыял дазволіў давесці факт існавання на тэрыторыі гістарычнага цэнтра Магілёва ў XII-XIII стст. умацаванага паселішча, якое, верагодна, выконвала функцыі адміністрацыйнага і фіскальнага цэнтра ваколіцы. Калі рэцэнзентка з гэтай тэзай не згодная, то хацелася б, каб яна яе аспрэчвала, а не рабіла выгляд, што аўтар ледзь не інтэрпрэтуе Магілёў таго часу як горад.

Дзіўна, калі не проста абразліва, выглядае выказванне спадарыні Ганецкай, у якім яна ставіць пад пытанне прафесійную вартасць аўтара як археолага. Хацелася б нагадаць, што большасць аўтарскіх справаздачаў абмяркоўваліся і рэкамендаваліся да зацвярджэння Палявому камітэту на аддзеле археалогіі і гісторыі Полацка і Полацкай зямлі. Сярод рэцэнзентаў аўтара былі такія абазнаныя прафесіяналы, як Юры Заяц, Людміла Дучыц, Вольга Ляўко і ...спадарыня Ганецкая! Такім чынам, шаноўная рэцэнзентка, сцвярджаючы аб прафесійнай непадрыхтаванасці аўтара кнігі, насамрэч паставіла пад пытанне як сваю прафесійную кампетэнцыю, гэтак і сваіх калегаў па аддзелу. Дарэчы, рэцэнзія, якую спадарыня Ганецкая ў свой час пісала на дысертацыю аўтара, адрозніваецца як неба і зямля і сваёй танальнасцю, і ацэнкамі ад рэцэнзіі кнігі, у грунт якой была пакладзена тая ж самая дысертацыя...

Наконт закідаў па разделу, у якім характарызуецца гандаль і гандлёвыя сувязі. Акрамя згаданага спадарыняй Ганецкай Лаўмяньскага можна дадаць яшчэ цэлы шэраг прозвішчаў даследчыкаў, якія займаліся вывучэннем гэтага пытання. Сярод іх і Выслаух, і Флароўскі, і Капыскі, і Мялешка. Але аўтар манаграфіі не ставіў сваёй мэтай рэферыраванне ды пераказ у гэтым раздзеле вынікаў працаў даследчыкаў, якія добра вядомы спецыялістам. Галоўнай мэтай было ўвесці ў ужытак археалагічныя матэрыялы, якія

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

дазваляюць скласці больш поўнае канкрэтна-гістарычнае ўяўленне па гэтаму пытанню. На гэтым, дарэчы, аўтар і акцэнтуе ўвагу на самым пачатку главы.

Але найбольш слабымі выглядаюць заўвагі рэцэнзенткі па 3-й главе. Спадарыня Ганецкая цвердзіць, што аўтар ідзе за крыніцамі, не здольны належным чынам іх аналізаваць. Дазволім цытату з рэцэнзіі, якая "абгрунтоўвае" гэтую выснову. "Але найбольш красамоўная ілюстрацыя падыходу аўтара да крыніц і імкнення да іх "вычарпальнага скарыстання" параграф "Матрыманіяльныя паводзіны насельніцтва ў XVI-XVIII стст.". Сустрэў спадар Марзалюк сярод пісьмовых крыніц сведчанні некалькіх яўных адступленняў ад нормы шлюбных традыцый і пераказаў іх нам у параграфе, які, паводле назвы, павінен быў бы змяшчаць інфармацыю пра матрыманіяльныя паводзіны, *тыповыя* для гараджан XVI-XVIII стст.".

Па-першае. На пачатку гэтага параграфа аўтар кнігі падкрэсліў, што яго цікавяць не толькі нормы ў гэтым пытанні, але і адхіленні ад іх. Па-другое, можа быць, рэцэнзентка лічыць *нетыповымі* для таго часу апісаныя формы пакаранняў за здраду, умовы, пры якіх наступала касацыя шлюбу, альбо прызнанне пэўнай правадзейнасці за нявенчаным шлюбам ды практыкаванне апошняга ў цікавячы нас час? Увогуле па гэтаму пытанню рэцэнзентка дэманструе поўную бездапаможнасць як у веданні крыніц, гэтак і ў гістарыяграфіі пытання. Спашлемся на меркаванне выбітнага польскага даследчыка прафесара Юліуша Бардаха, які прысвяціў адмысловую працу вывучэнню матрыманіяльных паводзін русінскага насельніцтва ВКЛ у XV-XVIIстст.: "На схіле XV ст. ... Толькі князі і баяры былі ...аб'ектам высілкаў увядзення шлюбаў хрысціянскіх. ...Шырока распаўсюджана была ў Русі Літоўскай «жона невенчана», тэрмін гэты ўжывалі яшчэ ў XVI ст. Статуты ВКЛ, што сведчыць аб усеагульнасці і жывучасці з'явы. ...сужэнства нявенчанае таксама вымагала разводу" [9, s.264-266]. Падобныя тэзы даследчыкам былі агучаны і ў яго працы "Дачыненні паміж праваслаўнымі і каталікамі ў Вялікім Княстве Літоўскім", якая, дарэчы, мусіць быць добра ведама спадарыні Ганецкай, бо ў перакладзе на беларускую мову друкавалася ў БГА [1].

Супярэчлівай і таму неабгрунтаванай падаецца аўтарцы рэцэнзіі выснова аб дамінаванні тэацэнтрызму і адначасна праявах антрапацэнтрызму ў XVI-XVII стст. З пазіцый фармальнай логікі са спадарыняй Ганецкай можна было б пагадзіцца, але гісторыю, гістарычны працэс бессэнсоўна разглядаць падобным чынам. Гістарычны працэс – з'ява дыялектычна супярэчлівая. А антрапацэнтрызм не сінанімічны бязбожжу, ён не ёсць адмаўленнем Бога, проста ў эпоху Рэнесанса інaчай пачынае інтэрпрэтавацца чалавек, славіцца Творца-Майстар як выбраннік Божы. Рэнесанс, дарэчы, не прывёў да кардынальных зменаў у масавай свядомасці насельніцтва Заходняй Еўропы. Таму дзіўна выглядае абвінавачванне ў падгонцы беларускіх рэалій пад заходнееўрапейскі стандарт, бо і ў Заходняй Еўропе, калі размова ідзе аб ментальнасці, сярэднявечча не скончылася ў эпоху Рэнесанса. Паводле аўтарытэтнага меркавання Жака Ле Гоффа, "доўгае сярэднявечча" ў Еўропе трывала да XIX стагоддзя [10, s.28]. У той жа Еўропе вядзьмарак спальвалі ў XVIII ст., у эпоху Асветніцтва! Аўтар манаграфіі казаў толькі аб кардынальных зменах у свядомасці майстра-творцы, асэнсаванні ім значнасці сваёй дзейнасці. Як інaчай, калі не ўплывам Рэнесансу, можна растлумачыць той факт, што мастацтва Беларусі XVI-XVIII стст. перастае быць ананімным, майстры-гравёры ды іканапісцы ў гэты час пачынаюць падпісваць свае творы? Альбо праявы новай працоўнай гарадской этыкі?

Падобныя прыклады навуковай "аб'ектыўнасці" і "карэктнасці" рэцэнзенткі можна было б доўжыць. Але ці трэба? Хацелася б пераадрасаваць спадарыні

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Ганецкай яе ж пажаданне, пры напісанні рэцэнзіі не баяцца "вялікага аб'ёму нуднай, чарнавой працы", а таксама не забывацца на элементарныя нормы прафесійнай этыкі, бо агульная танальнасць рэцэнзіі, яе з'едлівы, ментарскі тон, не дадаюць гонару чалавеку, які прэтэндуе на абазнанасць і прафесіяналізм.

***І.А.МАРЗАЛЮК,***
***кандыдат гістарычных навук,***
***дацэнт***

*ЛІТАРАТУРА*

1. ***Бардах Ю.*** Дачыненні паміж каталікамі і праваслаўнымі ў Вялікім Княстве Літоўскім // Беларускі гістарычны агляд. – 1994. – Т.1. – Сш.1. – С. 66-81.
2. Древняя Русь. Город, замок, село. – Москва, 1985.
3. ***Загорульский Э.М.*** Возникновение Минска. – Мн., 1982.
4. ***Заяц Ю.А.*** Заславль в эпоху феодализма. – Мн., 1995.
5. ***Іоў А.В., Вяргей В.С.*** Гандлёва-эканамічныя сувязі насельніцтва заходняга Палесся ў IX- пачатку XI стст. // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Мн., 1993. – Ч.1. – С. 117-134.
6. ***Молчанов А.А.*** Об атрибутации лично-родовых знаков князей Рюриковичей X-XIII вв. // Вспомогательные исторические дисциплины. – М., 1985. – Т.XVI. – С. 66-83.
7. ***Фехнер М.В.*** К вопросу об экономических связях древнерусской деревни // Очерки по истории русской деревни. – Москва, 1959. – С. 149-225.
8. ***Янин В.Л.*** Актовые печати Древней Руси X-XV вв. – Москва, 1970.
9. ***Bardach J.*** Studia z ustroju i prawa Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV-XVII w. – Warszawa, 1970.
10. ***Le Goff. J.*** Swiat średniowiecznej wyobrazni. – Warszawa, 1997.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова